## “Прыгоды ў зімовым лесе” ці “Дзе падзеўся Зюзя?”

**Мэта:** стварэнне умоў на занятку для замацавання ведаў па беларускай мове; развіццё мовы вучняў, мыслення, пазнаваўчай актыўнасці; выхаванне любові да роднай мовы, садзейнічанне выхаванню пачуцця калектывізму.

**Абсталяванне:** алоўкі, маршрутныя лісты для кожнай групы, інтэрактыўная дошка, прэзентацыя, карткі з заданнямі, малюнкі казачных герояў, елак, “запіска” ад Зюзі, запіс гукаў, слова “дапамагаць”, герой “Камячок”, сігнальныя карткі, смайлы для рэфлексіі.

### Ход мерапрыемства:

1. **Арганізацыйны момант.**

У мерапрыемстве удзельнічаюць усе вучні з 2-х першых класаў. Дзеці размяркоўваюцца на 6 груп. Групы складаюцца з вучняў аднаго класа.

- Добры дзень, сябры! Рада вас вітаць!

Верш чытаюць вучні і настаўнік. Гэтым часам дэманструюцца слайды з выявамі таго, аб чым гаворыцца ў вершы.

**СЛАЙД 2-4**

**Захоўвайце матчыны казкі і песні**

*Вучань.*
На роднай мове спяваюць рэчкі,
На роднай мове шумяць лясы.
І жытнія нівы ўплятаюць вечна
У гэта сугучча свае галасы.
*Вучань.*
На роднай мове зубры рыкаюць,
На роднай мове клякочуць буслы.
На роднай мове, зарнятак шукаючы,
Чырыкае і верабейка малы.
*Вучань.*
На роднай мове звіняць цымбалы,
На роднай мове жалейка гучыць.
І гэту жалейку з душою Купалы
Не можа ніякі арган заглушыць.
*Настаўнік.*
Людзей не згуртоўвае мова чужая,
І сэрца вярэдзіць мне неспакой:
А ты, мой дружа, говорыш, спяваеш
І молішся Богу на мове якой?
Захоўвайце матчыны казкі і песні,
Каб некалі тут, у краі сваім,
Не сорам было перад нівай і лесам,
Зубром і буслом, верабейкам малым.                    М. Маляўка.

**2. Падрыхтоўка да працы на асноўным этапе.**

- Сення мы з вамі адправімся ў падарожжа па зімовым лесе. Ці здагадаліся вы, на якой мове мы будзем размаўляць? Так, на роднай, беларускай. У лесе мы будзем гуляць у розныя гульні, калі нам ніхто не будзе перашкаджаць. У нас ёсць 6 груп, у канцы нашага падарожжа мы выявім, якая група вучняў самая актыўная.

**СЛАЙД 5**

На партах нумар каманды, маршрутны ліст, на якім будуць адлюстроўвацца адзнакі за заданні, карткі з заданнямі. У кажнай групе выбіраецца "Шустрык", той, хто будзе адказваць за выкананне задання, запаўненне машрутнага ліста.

- Лес, па якім мы будзем гуляць, казачны. У нас будзе памочнік – чароўны Камячок, які будзе нам дапамагаць у дарозе (прымацоўваю да дошкі слова "дапамагаць", падказка, перакладаю на рускую мову). Хто ж ён? (паказ героя без твару) Калі вы адгадаеце маю загадку, то даведаецесь з чаго ён зроблены і хто ён такі.

- На дварэ гарою, а ў хаце вадою. (Снег) Так, снег. Дык з чаго ж зроблены камячок? (са снегу, комочек снега на русском). Малайцы! Чагось не хапае у нашага сябра? Ці здагадаліcь чаго? (вочы, нос, рот называюць дзеці, настаўнік дамалёўвае). Вось цяпер усё ў парадку, мы яго ажывілі.

- Камячок нам падказвае, што каб увайсці ў чароўны лес, мы павінны ўспомніць беларускія словы.

<u>1).Размінка. Гульня "Перакладчыкі".</u> Я паказваю малюнак кожнай групе, дзеці называюць прадмет на беларускай мове. Кружочкамі – "снежнымі камячкамі" адзначаецца колькасць названых слоў.

**СЛАЙД 6-7**

<u>Словы, на слайдах малюнкі:</u> цукар, сукенка, цукерка, шкарпэткі, папера, падручнік, аловак, фарбы, спадніца, бульба, пэндзлік, гумка, журавіны, агрэст, шалік, боты, рукавіцы, футра.

- Малайцы! Каб пайсці ў зімовы лес, што мы па-першае павінны зрабіць? (добра апрануцца).

**СЛАЙД 8-11**

<u>2).Гульня "Апрані хлопчыка і дзяўчынку".</u> На сталах лісты з малюнкамі зімовага адзення для хлопчыка і дзяўчынкі. Злучыць лініямі аддзенне з дзяўчынкай і хлопчыкам, затым "Шустрык" называе словы-аддзенне на беларускай мове. Правільнасць выканання адзначаецца "камячком" на лісце.

- Вось мы і сабраліся. Скажыце, а якое надвор'е ў казачным лесе, як вы думаеце? (ціхае, марознае, яскравае, сонечнае, снежнае, па аднаму слову называюць).

**3. Асноўны этап.**

**СЛАЙД 12**

- Вой, а што гэта здарылась? (гукі завеі).

**Мяцеліца**

Нізка звіслі над зямлёю
Хмары снегавыя.
Свішча вецер за сцяною,
У коміне вые.
Лес гудзе, дрыжаць галіны,
Стогне бор хваёвы,
Злосна выюць верхавіны,
Гнуцца іх галовы. Я. Колас.

**СЛАЙД 13-14**

- Паглядзіце, з хмаркі пасыпалісь сняжынкі, а на іх нешта ёсць, што гэта? (Літары). Яна нам хоча штосьці паведаміць.

3).Гульня "Складзі слова і сказ". На слайдзе з хмаркі "падаюць" склады на сняжынках: "Зю-зя пра-паў. Да-па-ма-жы-це!" На сталах карткі-сняжынкі са складамі, на сняжынках запісаны лікі ад 1 да 9, разлажыць карткі з лікамі ў парадку ўбывання, скласці словы і прачытаць. Вызначаецца група, якая першая прачытае сказы. Малюецца "камячок" на лісце.

- Дзеці, а хто такі Зюзя? Казачны беларускі лес ніяк не зможа быць без Зюзі. Дапаможам нашаму Дзеду Марозу вярнуцца дамоў? Яшчэ хмарка сказала мне, што Зюзя адправіў да нас птушак з запіскай. Каб птушкі нам яе аддалі, мы павінны іх пакарміць, бо гэтым займаўся Зюзя раней, зараз зрабіць ён гэтага не можа.

4).Гульня "Пакармі птушак". На дошцы прымацаваны выявы кармушак за надпісамі: "2 склады", "3 склады", побач малюнкі зімуючых птушак (сарока, варона, сініца, верабей, снягір, галка, бусел). Бусла дзеці павінны вылучыць, як лішняга, таму што ён адлятае ў вырай. З кожнай групы выходзіць адзін вучань, дзеліць слова на склады і прымацоўвае да адпаведнай кармушкі. За правільны адказ атрымліваюць "камячок".

**СЛАЙД 15**

- Ну вось, птушкі аддалі нам запіску. Зараз прачытаем, што там напісана: "Дзень добры дзеці. Пасля таго, як вы прагналі Бабу Ягу са свята, яна задумала лесу нашкодзіць. Пазнаў пра гэта Лесавік і, каб зберагчы лес ад Ягі, заблытаў усе дарогі і сляды ў лесе, ды так стараўся, што перастараўся. І я не магу знайсці дарогу. Прагадіце Бабу Ягу зноў, тады Лесавік усё разблытае назад. Дапамажыце, калі ласка!" Ваш Зюзя.

- Дапаможам? Каб дабрацца да Ягі, вы павінны выканаць адно заданне. Але, перш, чым ісці шукаць Бабу Ягу, давайце адпачнем і набяромся моцы.

*Фізкульхвілінка "Беларусачка" (відэа).*

**СЛАЙД 16**

5).Гульня "Прагані лішняе слова". Лесавік пераблытаў словы. Назваць лішняе слова і сказаць, чаму яно лішняе (слухаем словы):

Чайка, пячэнне, чуб, стук.

Рабіна, рыс, лапа, рэпа.

Дзік, дзень, дом, дзіва.

Джала, джынсы, жырафа, ураджай.

Воўк, лаўка, сава, пеўнік.

Газета, голас, гараж, холад.

Дзеці знаходзяць слова, у якім няма такога адметнага гука беларускай мовы, які ёсць у астатніх словах. Дадатковы "камячок" атрымае тая група, якая адкажа, што абазначаюць словы "Лешы заблытаў" – чалавек не падумаў, перш чым зрабіў нешта няправільна, кепска; зрабіць памылку. За правільнае выкананне малююць "камячок".

- Недзе ўжо блізка Баба Яга, хаваецца за елкамі. Каб яе выманіць, давайце хорам, паўтараючы за мной, вымавім хітрыя словы, яны прыйдуцца Бабе да спадобы, не вытрымае старая і выйдзе да нас. Не баіцесь? Ну тады паўтарайце за мной.

Чыстагаворка:

Хі-хі-хі – добра чуе, не глухі.
Ха-ха-ха – у вас даўно цячэ страха.
Хі-хі-хі – праляцелі ля страхі.

На **СЛАЙДЗЕ 1, ПР.2.** Баба Яга. Гукі Ягі.

- Каб прагнаць яе, хутчэй кідайце ў яе рознакаляровыя камячкі, ды толькі правільна колер называйце!

6).Інтэрактыўная гульня "Прагані Бабу Ягу". На слайдзе малюнак Бабы Ягі, горка снегу. Дакрануцца да горкі снегу, назваць колер камячка, які з'явіўся (рознакаляровыя кружочкі) на беларускай мове: ружовы, сіні, чырвоны, зялены, жоўты, фіялетавы, аранжавы, белы, чорны, карычневы, блакітны. Гульня працягваецца толькі пасля таго, як будзе названы правільна колер, які з'явіўся на слайдзе. "Шустрык" адзначае ў лісце колькасць названых колераў, малюючы "камячкі".

- Малайцы! Баба Яга вярнулася ў свой лес.

**СЛАЙД 17**

- Ой, што гэта? (гукі слядоў на снезе). Хто гэта? Гэта Зюзя вярнуўся! (на слайдзе.)

**4. Вынікі.**

- Вы добра папрацавалі, зрабілі шмат добрых спраў. Цікавае атрымалася падарожжа. Выратавалі Зюзю, за гэта ён запрашае вас да сябе ў госці наступнай зімой. Хто памятае, дзе мы былі на экскурсіі? (Нацыянальны парк "Прыпяцкі").

Падвядзенне вынікаў, падлік "камячкоў", вызначэнне лепшай групы (1,2,3 месца, ўручаюцца медалі).

**5. Рэфлексія.** У кожнай групы на стале дзве зорачкі – дзве думкі. Выходзіць да дошкі "Шустрык", прымацоўвае зорачкі да смайлаў з рознымі эмоцыямі, і тлумачыць (які мой настрой, як ладзілася праца ў групе).